- утрымлівае механізм самакантролю, самакарэкцыі і самаацэнкі індывідуальных вучэбных дасягненняў;
- раскрывае тэхналогію вучэбна-пазнавальнай дзейнасці.

Методыка падрыхтоўкі сучаснага падручніка падразумявае творчае асэнсаванне папярэдняга вопыту па стварэнні вучэбнай кнігі, захаванне класічных, прагрэсіўных набыткаў пройдзенага шляху з выкарыстаннем найноўшых адукацыйных тэхналогій.

**Літаратура**


1. Бахтин М.М. Эстетика словесного творчества. Изд. 2-е. М.: Искусство, 1986. 444 с.
2. Зуев Д.Д. Школьный учебник. М.: Педагогика, 1983. 240 с.
3. Лапцёнак І. Мы ствараем беларускі нацыянальны падручнік // Настаўніцкая газета. 2002. 3 снежня. С. 3.
4. Мечковская Н.Б. Концепция и методы грамматик XVI–XVII веков как элемента книжно-письменной культуры восточного славянства: Автореф. дис… д-ра филол. наук: 10.02.02. Мінск, 1986. 38 с.


**Г.Ф. Герасіменка**

# ВЫКАРЫСТАННЕ ДЫСКУРСІЙНЫХ ФОРМ НАВУЧАННЯ НА ЗАНЯТКАХ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)

Праблема фарміравання творчай асобы спецыяліста, прафесіянала ў межах новай педагагічнай парадыгмы вышэйшай школы сёння надзвычай актуальная. Незалежна ад сутнасці і спецыфікі вучэбнай дысцыпліны на першы план выступае задача навучыць студэнтаў арыентавацца ў інфармацыйнай плыні, узброіць інструментам адбору і крытычнага асэнсавання фактаў, з’яў, бачыць выключэнні з правілаў. У сувязі з гэтым функцыя выкладчыка ў некаторай ступені мяняецца. Сёння выкладчык павінен будаваць заняткі такім чынам, каб кожны студэнт стаў непасрэдным удзельнікам практычнай дзейнасці, меў магчымасць выказаць тэарэтычны, навуковы пункт гледжання па тэме, прадставіць свае адказы на пытанні. Стварэнне атмасферы творчага пошуку – галоўная ўмова, якая павінна быць забяспечана ў працэсе падрыхтоўкі, арганізацыі і правядзення заняткаў.

У гэтым выкладчыку павінны дапамагчы такія формы і спосабы арганізацыі навучальна-пазнавальнай дзейнасці, акія арыентаваны на праблемна-дыялогавае, індывідуалізаванае навучанне. Мэтай такога

навучання з’яўляецца фарміраванне ў студэнтаў здольнасці да пастаяннай самаадукацыі. Уменні пераапрацоўваць інфармацыю ў свае асабістыя веды, самастойна арганізоўваць пошукавую дзейнасць, аргументавана адстойваць сваю думку могуць забяспечыць поспех у далейшым і ў прафесійнай і ў любой іншай дзейнасці.

Аналізуючы перавагі метадаў актыўнага навучання на занятках па беларускай мове, трэба адзначыць, што яны, паводле І. Ахметавай, дазваляюць перайсці да парадыгмы, пабудаванай на засваенні набора ведаў, да магчымасці асобасна афарбаваць атрыманую інфармацыю і лёгка ўключыць яе ў цэласную сістэму ўяўленняў пра мову; забяспечваць актыўную пазіцыю студэнтаў; ствараць умовы для выпрацоўкі шэрагу навыкаў камунікатыўнага плана; садзейнічаць асобаснаму развіццю студэнтаў, развіццю іх інтэлектуальных здольнасцей [1].

У аснове ўсіх актыўных і інтэрактыўных форм навучання ляжыць метад, вядомы яшчэ са Старажытнай Грэцыі, – дыскусія.

Сучасная дыскусія ўяўляе сабой адукацыйную тэхналогію, накіраваную як на навучанне, так і на выконванне, і на развіццё студэнтаў. На занятках па беларускай мове (прафесійная лексіка) гэтая форма выкарыстоўваецца з улікам спецыфікі прадмета. Па сутнасці, гэта можа быць непасрэдна дыскусія ў форме сімпозіума, дыскусія ў стылі тэлевізійнага ток-шоу, “мазгавы штурм”, дэбаты, дыспут, “круглы стол”, тэматычны семінар, семінар-даследаванне.

На што трэбы звярнуць увагу, рыхтуючыся да дыскусіі? Перш за ўсё трэба вызначыцца з выбарам тэмы ці прадмета абмеркавання, бо ад гэтага залежыць, ці будзе дыскусія выклікаць цікавасць у студэнтаў. Тэма павінна быць сфармулявана такім чынам, каб быў відавочны праблемны характар дыскусіі. Неабходнай умовай падрыхтоўкі з’яўляецца наяўнасць двух (ці больш) пунктаў гледжання на праблему, якая будзе абмяркоўвацца студэнтамі. Кожны пункт гледжання павінен мець дастатковую, канкрэтную і зразумелую аргументацыю, падмацаваную пры неабходнасці пэўнымі крыніцамі. Працэс падрыхтоўкі і абмеркавання павінен кантраляваццa выкладчыкам. Тэма апавяшчаецца загаддзя, вызначаецца рэгламент выказванняў, размяркоўваюцца ролі (вядучы, эксперт, хранаметрыст), абмяркоўваюцца асноўныя пытанні дыскусіі. У працэсе дыскусіі выкладычку належыць асобая роля: гэтая форма заняткаў патрабуе ад яго імгненнай рэакцыі на настрой аўдыторыі, умення стварыць нестандартную сітуацыю, кіраваць пошукавым працэсам так, каб удзельнікі дыскусіі захоўвалі культуру моўных зносін, не выходзілі за

межы праблемы, з павагай ставіліся да сваіх апанентаў і слухачоў. Абавязковым элементам дыскусіі з’яўляецца падвядзенне вынікаў. Дакладна і сцісла сфармуляваны вывад, з якім згаджаецца большасць удзельнікаў, сведчыць пра паспяхова праведзеныя заняткі.

Трэба адзначыць, што дыскусія – даволі складаная форма заняткаў, якая патрабуе пэўнай падрыхтоўкі самога выкладчыка, добрага ведання аўдыторыі, студэнтаў, іх інтэлектуальнага ўзроўню, псіхалагічнага настрою, мікраклімата ў групе. Акрамя таго, улічваючы спецыфіку прадмета, студэнты павінны добра валодаць беларускай мовай, мець належны размоўны ўзровень, інакш зніжаецца ўспрыняцце інфармацыі і запавольваецца тэмп дыскусіі.

Добры эффект пры правядзенні заняткаў па беларускай мове мае дыскусія ў стылі тэлевізійнага ток-шоу. Асаблівасць гэтай формы ў тым, што некалькі студэнтаў (група з 3–5 чалавек) абмяркоўваюць канкрэтную праблему ў прысутнасці аўдыторыі. Астатнія ўдзельнікі ток-шоу – гледачы ўступаюць у абмеркаванне пазней: яны ці выказваюць сваю думку ці задаюць пытанні непасрэдным удзельнікам гутаркі. Гэтая методыка дае магчымасць дакладна выказаць розныя пункты гледжання па зададзенай тэме. Аднак трэба памятаць, што ўдзельнікі абмеркавання павінны быць дастаткова кампетэнтныя ў праблеме і добра падрыхтаваныя да гутаркі. Ход дыскусіі ў стылі тэлевізійнага ток-шоу можа быць наступным. Вядучы (гэтую ролю выконвае адзін са студэнтаў, які мае добры вопыт публічных выступленняў і кантактаў з аўдыторыяй) вызначае тэму, запрашае ўдзельнікаў, паведамляе ўмовы заняткаў. Аўдыторыя папярэдне афармляецца належным чынам, сталы расстаўляюцца падковаю ці літарай П. Асноўныя ўдзельнікі садзяцца перад гледачамі. Пасля кароткага ўступу пачынаюцца выступленні, якія працягваюцца 20–25 хвілін. Затым вядучы дае слова ўдзельнікам-гледачам. Выступленні павінны быць канкрэтнымі, зразумелымі, дакладнымі. У ходзе іх аўдыторыя падзяляецца на палярныя, супрацьлеглыя групоўкі. Дыскусію накіроўвае вядучы і на пэўным этапе дае слова эксперту. Ім можа быць запрошаны спецыяліст-навуковец, журналіст ці сам выкладчык. І нарэшце адбываецца калектыўнае падвядзенне вынікаў, а таксама аналіз выказванняў асноўных ўдзельнікаў дыскусіі.

У ходзе дыскусіі выкарыстоўваецца музыка, спецыяльныя музычныя сігналы, вершы, песні, запісы тэкстаў. Удзельнікі-гледачы маюць спецыяльныя карткі са знакамі пытальнікаў, клічнікаў, плюсаў, мінусаў, а

таксама карткі зялёнага і чырвонага колераў, што могуць быць выкарыстаны для галасавання, калі гэта, на думку вядучага, неабходна.

Так, у ходзе дыскусіі “Адна мова – адзін народ?” студэнты праявілі выключную зацікаўленасць і актыўнасць. Абмяркоўваючы аспекты беларуска-рускага білінгвізму, яны характарызавалі сучасную моўную сітуацыю на Беларусі як даволі складаную. У выніку дыскусіі быў зроблены вывад, што пачуццё адзінства мовы – гэта адзін з асноўных кампанентаў нацыянальнай свядомасці. Студэнты-біёлагі пагадзіліся з тым, што авалоданне нацыянальнай мовай – неабходная ўмова фарміравання самасвядомасці асобы, далейшага ўваходжання ў шматнацыянальны свет, у шматмоўную сістэму міжнароднай камунікацыі, а агульналінгвістычная адукаванасць – грамадская патрэба духоўна-культурнага развіцця асобы.

Дыскусія-сімпозіум па сваёй форме менш складаная. Група з 3–4 студэнтаў-лектараў рыхтуе паведамленні-даклады па пэўнай праблеме (напрыклад “Біялагічнае, сацыяльнае і індывідуальнае ў мове”) і выступаюць перад аўдыторыяй. Працягласць выступлення – 15–20 хвілін. Затым пачынаецца абмеркаванне. Гэтая форма заняткаў таксама спрыяе развіццю творчага мыслення, пашырае і паглыбляе веды па вывучанай тэме, спрыяе фарміраванню навыкаў навукова-даследчай работы, выхаванню адказнасці і дысцыпліны.

Студэнты з цікавасцю ставяцца да такой формы заняткаў, як абмеркаванне рэфератаў і дакладаў. Напісанне рэферата фарміруе ўменне аналітычнай дзейнасці, садзейнічае выхаванню ўмення працаваць з арыгінальнымі крыніцамі, лагічна будаваць другасны тэкст, выдзяляць галоўнае, істотнае. Акрамя таго, для выкладчыка рэферат цікавы тым, што ён з’яўляецца сродкам праверкі ведаў стадэнтаў. Выкладчык кіруе пошукавай працай студэнтаў у ходзе падрыхтоўкі матэрыялу для рэферата, акцэнтуе ўвагу студэнтаў на тым, што інфармацыя павінна быць дакладная, зразумелая і цікавая для ўсёй аўдыторыі. Пры абмеркаванні рэфератаў фарміруецца ўменне аргументавана адстойваць сваю думку, уважліва слухаць, тактоўна рабіць заўвагі і задаваць слушныя пытанні. З вопыту працы магу адзначыць, што цікавасць у студэнтаў выклікаюць тэмы, звязаныя з персаналіямі: дзеячамі беларускага нацыянальнага адраджэння, а таксама з гістарычнымі этапамі фарміравання і развіцця беларускай мовы.

Такім чынам, можна адзначыць, што метады актыўнага навучання даюць шэраг пераваг, што сёння з’яўляецца вельмі актуальным. Студэнты

вучацца здабываць веды асабістымі намаганнямі, ліквідуюць інфармацыйныя прабелы, працуючы з разнастайнымі крыніцамі. У ходзе дыскусіі і абмеркавання веды грунтоўна засвойваюцца. Студэнты вучацца дакладна фармуляваць сваю пазіцыю і актыўна адстойваць яе.

Правядзенне такіх заняткаў прымушае звярнуць увагу і на недахопы, якія робяцца відавочнымі: недастатковы ўзровень моўнай культуры студэнтаў, адсутнасці навыкаў публічных выступленняў, жаданне “перамагчы” апанента любымі сродкамі, недастатковае валоданне беларускай мовай.

Выкарыстанне інтэрактыўных методык навучання дае пэўныя перавагі ў працы і выхаванні. Пераход ад традыцыйнага, рэпрадукцыйнага спосабу выкладання і засваення ведаў да найбольш высокіх узроўняў самастойнай дзейнасці студэнтаў абавязкова будзе спрыяць росту творчай асобы будучага спецыяліста.

**Літаратура**

1. Ахметова И.Ф. Дискуссионный метод обучения личности // Школа. 2005. № 2.
2. Гимпель Л.П. Творческая направленность личности как психолого-педагогическая проблема // Адукацыя і выхванне. 2005. № 7.

**Е.Е. Долбик**

## СИНТАКСИЧЕСКИЕ СРЕДСТВА ВЫРАЗИТЕЛЬНОСТИ РУССКОЙ РЕЧИ В ШКОЛЬНОМ УЧЕБНИКЕ РУСКОГО ЯЗЫКА

Общеизвестно, что в практике школьного преподавания русского языка эстетической функции языка уделяется недостаточно внимания. “За унылой чередой разных видов грамматического разбора, списков слов для заучивания, бесконечных рамочек в учебниках и напряженных ожиданий результатов очередного контрольного диктанта не видят дети в языке самого главного – его удивительного богатства и красоты” [2, с. 3]. Российскими методистами намечен один из путей решения этой проблемы, суть которого состоит в интеграции двух школьных предметов – русского языка и русской литературы, во введении интегрированного курса русской словесности, представлены прекрасные образцы реализации такого курса [2, 7 и др.].

В Республике Беларусь, согласно Концепции обучения русскому языку в 12-летней общеобразовательной школе, одной из задач обучения